ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 17 (918) | Аўторак, 26 ЛІСТАПАДА 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ДАПАЎНЕННЕ ЎНЁС РЭКТАР

На пасяджэнні прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якое адбылося ў лістападзе, выступіў рэктар Л.А. Шамяткоў. Ён унёс дапаўненне ў калектыўны дагавор. Яно датычыцца размеркавання жылля, якое належыць універсітэту. Цяпер гэта пытанне будзе вырашацца з удзелам прафкома.

Л.А.Шамяткоў падзяліўся на прафкоме сваімі ўражаннямі аб сустрэчах у пачатку верасня г.г. з Прэзідэнтам А.Р.Лукашэнкам, гаварыў аб эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай сітуацыі ў краіне, аб стане і перспектывах развіцця адукацыі ў цэлым і ў тым ліку вышэйшай школы. Затым Леанід Аляксандравіч адказаў на зададзеныя пытанні.

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М. Воінаў у сваім выступленні спыніўся на пытанні далейшага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканалення выхаваўчай работы. У прыватнасці, ён адзначыў, што на ўсіх факультэтах аднобўлена куратарства, будзе ажыццяўляцца строгі кантроль за наведваннем заняткаў. Пры 18 гадзінах іх пропуску без уважлівых прычын дадзена права пазбаўляць студэнтаў стыпендыі і пры пропуску адпаведна 48 гадзін у семестр выключаць прагульшчыкаў з універсітэта.

## УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 453

### Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 жніўня 1996 г. N 320

Пункт 3 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 жніўня 1996 г. N 320 "Аб павелічэнні прыёму студэнтаў у дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы" (Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1996 г., N 24, арт.610) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"3. Устанавіць, што:

кошт платнага навучання ў дзяржаўнай вышэйшай навучальнай установе не павінен перавышаць фактычных затрат на падрыхтоўку спецыяліста ў гэтай навучальнай установе;

сродкі, атрыманыя ад платнага навучання ў дзяржаўных вышэйшых навучальных установах, накіроўваюцца на аплату працы іх прафесарска-выкладчыцкага персаналу, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, навучальна-метадычнае забеспячэнне і гаспадарчыя патрэбы;

выдатна паспяваючыя студэнты, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у навучальна-пазнавальнай і навукова-даследчай дзейнасці, могуць быць пераведзены рэктарамі дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў з платнага навучання на бясплатнае".

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А.Лукашэнка.**

5 лістапада 1996 г.

г.Мінск.

## ПРАФСАЮЗНЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

Згодна пастановы Прэзідыума Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі для студэнтаў ВНУ заснаваны прафсаюзныя стыпендыі. У нашым універсітэце яе ўдастоены чацвёртакурснік факультэта фізічнай культуры Віктар Вайцішкін.

Размер названай стыпендыі складае дзве мінімальныя заработныя платы. Яна выплачваецца як даплата да асноўнай студэнцкай стыпендыі.

***

Упершыню ў практыцы работы прафкома студэнтаў ГДУ ўстаноўлены дзве стыпендыі для прафсаюзных актывістаў універсітэта. Па рашэнню прафкома гэтыя стыпендыі назначаны старшыням прафбюро: фізічнага факультэта -- пяцікурсніку Пятру Сухоцкаму, біялагічнага -- трэцякурсніку Міхаілу Марчанку.

## ДУХОЎНЫ ПАДАРУНАК

На якія маральныя арыенціры абапірацца сёння людзям, і асабліва моладзі? Гэта пытанне хвалюе цяпер надзвычай востра, калі ўлічыць складаную і палітычную, і эканамічную сітуа-цыю ў нашай краіне. Як не дапусціць далейшага зніжэння духоўнага ўзроўню грамадства? У апошні час даводзіцца вельмі часта чуць думку, што надзейную духоўную апору ў жыцці можа даць чалавеку рэлігія, хрысціянства.

Нядаўна універсітэцкая бібліятэка атрымала падарунак ад Сабора святых Пятра і Паўла, што ў гомельскім парку. Айцец Уладзімір перадаў сюды духоўную літаратуру -- кнігі, брашуры (усяго звыш 250 экземпляраў), якія з'яўляюцца скарбонкай духоўнай народнай мудрасці, хрысціянскіх дабрадзейнасцей і запаветаў. Сярод назваў кніг ёсць, напрыклад, такія як "Іаан Златавуст", "Святая Біблія. Новы Запавет", "Катэхізіс", "Як лягчэй перамагчы грэх" і інш.

Карыстацца літаратурай змогуць у трох чытальных залах бібліятэкі ўсе жадаючыя студэнты і выкладчыкі.

**(Наш кар.)**

## ПЛЁН АЛГЕБРАІЧНАЙ ШКОЛЫ

У мінулым годзе пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны створаны спецыялізаваны Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па матэматычных дысцыплінах. Гэта стала яшчэ адным доказам шырокага прызнання і сапраўднага аўтарытэту гомельскай алгебраічнай школы, ля вытокаў якой стаяў выдатны вучоны акадэмік С.А.Чуніхін. Пасля яго ўжо на працягу многіх гадоў гэтую школу ўзначальвае вучань Сяргея Антонавіча доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі рэктар ГДУ Л.А.Шамяткоў.

Выдатны пачатак рабоце названага Савета паклаў малады вучоны С.Ф.Каморнікаў, які летась бліскуча абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Яна была прысуджана яму Прэзідыумам Вышэйшай Атэстацыйнай Калегіі. Праз пэўны час Сяргей Фёдаравіч стаў прафесарам кафедры алгебры і геаметрыі, а ў канцы верасня 1996г. загадам БелВАКа ён уведзены ў склад названага Савета па абароне дысертацый.

Як кажуць у народзе, якім быў пачатак, такім

(ЗАКАНЧЭННЕ на 2-стар.)

# ПЛЁН АЛГЕБРАІЧНАЙ ШКОЛЫ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 1-стар.)

павінен стаць працяг. Прыемна зазначыць, што ён радуе. На наступных пасяджэннях спецыялізаванага Савета кандыдацкія дысертацыі па матэматыцы паспяхова абаранілі выпускнікі універсітэцкай аспірантуры В.В.Аніськоў, сорасаўская аспірантка Л.П.Аўдашкова, С.П.Новікаў. Першыя двое з іх цяпер выкладаюць на кафедры алгебры і геаметрыі і працягваюць актыўна займацца навуковымі даследаваннямі, апошні -- у Беларускім дзяржуніверсітэце транспарту.

Бадай, самым адметным у летапісу спецыялізаванага Савета стане нядаўна прайшоўшае лістападаўскае пасяджэнне. Па спецыяльнасці "Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў" у адзін дзень абаранялася адразу тры аспіранты доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, загадчыка кафедры алгебры і геаметрыі А.М.Скібы.

Пачатак пасяджэння Савета быў некалькі незвычайным. Пасля ўступнага слова яго старшыня Л.А. Шамяткоў ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў дыплом кандыдата фізіка-матэматычных навук В.В.Аніськову.

Затым пачаліся абароны дысертацый. Першым вельмі хвалюючы і адказны экзамен трымаў В.Р.Сафонаў, які ў 1991г. з адзнакай закончыў ГДУ, паспяхова вучыўся ў аспірантуры, мае 12 навуковых прац. Яго дысертацыя "Кратна лакальныя фармацыі з зададзенай рашоткай падфармацый" выклікала глыбокую цікавасць у прысутных на абароне, атрымала высокую ацэнку апанентаў і прыняўшых удзел у дыскусіі вучоных-алгебраістаў.

Вышэй сказанымі словамі можна гаварыць і пра дысертанта В.М. Селькіна. Дабавім толькі, што ён быў сорасаўскім аспірантам і стыпендыятам Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь. На яго рахунку -- 13 навуковых прац. Яны запоўнілі некаторыя істотныя прабелы ў алгебраічнай навуцы.



В.Р.САФОНАЎ



В.М.СЕЛЬКІН



Дж.Дж.ДЖУМАХ

У адзін месяц і год з В.М. Селькіным -- жнівень, 1969г. (дарэчы, год заснавання нашага універсітэта) -- нарадзіўся Джарадзін Джэхад Джумах з горада Тафілы (Іарданія). У 1993 годзе ён паспяхова закончыў матэматычны факультэт ГДУ і паступіў у аспірантуру пры кафедры алгебры і геаметрыі. За восем гадоў жыхарства ў Гомелі Джарадзін добра авалодаў рускай мовай і на ёй з выдатным веданнем даследавання абараніў сваю кандыдацкую дысертацыю.

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў іарданскі матэматык высока ацаніў гомельскую алгебраічную школу, сказаў, што яна адна з самых вядомых у свеце. Джарадзін адзначыў, што беларускі дыплом кандыдата фізіка-матэматычных навук дае яму права атрымаць і дыплом доктара філасофіі.

У кароткім інтэрв'ю замежны вучоны сказаў, што ў хуткім часе вернецца на радзіму і там будзе выкладаць матэматыку ва універсітэце, а аб Гомелі ў яго застануцца самыя добрыя ўспаміны.

Напрыканцы трэба адзначыць, што ва ўсіх дысертантаў былі шырока вядомыя і вельмі патрабавальныя апаненты. Гэта -- дактары навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны М.С.Чэрнікаў, загадчык кафедры прыкладной матэматыкі Наваполацкага дзяржуніверсітэта Э.М.Пальчык, загадчык кафедры алгебры Бранскага педуніверсітэта імя акадэміка І.Г.Пятроўскага В.А.Вядзернікаў, прафесар Віцебскага дзяржпедуніверсітэта М.Ц.Вераб'ёў, дацэнты У.І.Гайко і А.В.Семянтоўскі з Гомеля. У якасці апаніруючых арганізацый выступілі Краснаярскі дзяржуніверсітэт і Інстытут матэматыкі НАН Украіны. І вельмі прыемна, што прысутнічаючыя на абароне члены спецыялізаванага Савета аднагалосна прагаласавалі за прысуджэнне В.Р.Сафонаву, В.М.Селькіну, Дж. Дж.Джумаху вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

**Б.ВАЛОДЗІН.**



*Імі ганарыцца універсітэт*

# КАЛІ ЁСЦЬ МЭТА...

Гэты выпадак са школьнага жыцця Вользе ўспамінаецца часта, і асабліва ў тыя моманты, калі трэба зрабіць выбар, ад якога потым будзе многае залежыць. У чацвёртым класе настаўніца матэматыкі паставіла дзяўчынцы за чвэрць чацвёрку. Хаця тая злашчасная адзнака ў строгай выкладчыцы прыраўноўвалася да вышэйшага бала (ніхто ў класе не меў у яе пяцёрку), Вольга Шпырко дала цвёрдае слова: "Я павінна даказаць і настаўніцы, і сабе, што змагу ведаць прадмет на "выдатна". Настойлівасць, упартасць, вера ў свае сілы прынеслі ўсё ж жаданы вынік -- настаўніца "здалася".

З першых школьных гадоў матэматыка стала любімым прадметам дзяўчыны, і яна яшчэ тады вырашыла, што менавіта з ёй будзе звязана яе далейшае жыццё. Школьнай праграмы Вользе было ўжо недастаткова і ў старэйшых класах яна вучыцца завочна ва Усесаюзнай матэматычнай школе, рэспубліканскай фізіка-матэматычнай і хімічнай школе, у адзінаццатым класе становіцца пераможцай гарадской алімпіяды па матэматыцы, з залатым медалём заканчвае СШ N19 г.Гомеля. Ёй вельмі хацелася вучыцца далей у МДУ, але палітычныя падзеі, што адбыліся ў той час у краіне, не дазволілі збыцца мары. І вось Вольга Шпырко -- студэнтка матфака ГДУ. Як і ў школьныя гады, адзнакі ў вучобе толькі выдатныя, дзякуючы і багатаму запасу накопленых ужо ведаў, і выкладчыкам, якія дасканала ведаюць свае дысцыпліны, могуць зацікавіць імі студэнтаў. Сярод іх Вольга выдзеліла для сябе як найлепшых педагогаў дацэнта А.У.Гаўрылюка, які чытае лекцыі па матаналізу, і прафесара кафедры алгебры і геаметрыі В.С.Манахава. Пад кіраўніцтвам Віктара Сцяпанавіча Вольга паглыблена вывучае такі раздзел алгебры як тэорыя канечных груп (выбрала яе сваёй спецыялізацыяй).



Калі чалавек ставіць перад сабой канкрэтную мэту, ён заўсёды можа яе дасягнуць -- такі прынцып абрала для сябе студэнтка ў вучобе і ў жыцці наогул. Яна не чакае, што ўсё жаданае прыйдзе само па сабе, лёс падаруе яго, як кажуць, на талерачцы. Вольга сама ў пастаянным пошуку таго, што можа дапамагчы ў поўнай меры ажыццявіць задуманае. Яе імкненне да самаўдасканалення рэалізуецца ў канкрэтных справах. Так, калі выпадкова даведалася, што ў Гомелі па праграме Еўрапейскага саюза "Тасіс" будзе чытацца цыкл лекцый па прадпрымальніцтву, стала яго слухачкай і атрымала потым адпаведны сертыфікат.

Поспех прыходзіць да людзей дапытлівых, якія не палохаюцца карпатлівай працы, цяжкасцей. І Вольга дасягнула яго. Яна ўдастоена стыпендыі імя Ф.Скарыны, а зусім нядаўна ў яе жыцці адбылася прыемная, радасная падзея: рашэннем Беларускага Кансультатыўнага Савета ISSEP Вользе Шпырко прысуджаны грант на атрыманне Сорасаўскай стыпендыі ў галіне дакладных навук. Яна прайшла даволі патрабавальны конкурс, пераможцы ў якім вызначаліся па сукупнасці дасягненняў. Сорасаўская стыпендыя пасадзейнічае далейшаму росту творчай актыўнасці Вольгі, самаўдасканаленню і развіццю здольнасцей у абранай сферы дзейнасці.

Такія значныя поспехі студэнткі, безумоўна, адымаюць шмат часу, але Вольга ўмее знаходзіць яго і на любімыя захапленні -- музыку, танцы (займаецца імі з дзяцінства), на гімнастыку, шэйпінг. А яшчэ -- на ваджэнне аўтамабіля, на што атрымала права пасля заканчэння курсаў вадзіцеляў.

... Цікавы, рознабаковы, а самае галоўнае, мэтанакіраваны чалавек чацвёртакурсніца матфака Вольга Шпырко. Няхай і далей спадарожнічае ёй поспех, збудуцца яе мары, бо, як сцвярджаюць вядомыя словы, "Дорогу осилит идущий".

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку Вольга Шпырко.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

*У прафкоме студэнтаў*

## НОВЫ НАМЕСНІК СТАРШЫНІ

На чарговым пасяджэнні прафкома студэнтаў разгледжана арганізацыйнае пытанне. Намеснікам яго старшыні членамі прафкома аднагалосна абраны студэнт чацвёртага курса гісторыка-юрыдычнага факультэта, актыўны ўдзельнік грамадскага і культурнага жыцця універсітэта **Руслан Банькоўскі.**

## КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ЭМБЛЕМУ

З кастрычніка па снежань бягучага года праводзіцца рэспубліканскі конкурс на лепшую эмблему Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Эскіз эмблемы (у каляровым і чорна-белым афармленні) удзельнікам конкурсу неабходна накіроўваць да і студзеня 1997г. на адрас:

**220126, г.Мінск, праспект Машэрава, 21, Беларускі рэспубліканскі камітэт прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

Вынікі конкурсу падводзяцца ў студзені 1997 года на пасяджэнні Прэзідыума Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Для ўзнагароджання пераможцаў устаноўлены тры прэміі: першая -- адзін мільён руб; другая -- 800 тыс. руб; трэцяя -- 500 тыс. руб.

# ІДЗЕ ЭКСПЕРЫМЕНТ...

Ужо трэці год даследчы калектыў кафедры педагогікі (дацэнт В.П.Горленка, асістэнты Н.А.Садоменка, Е.М.Коцур і І.Т.Зайцава), які ўзначальвае прафесар І.Ф.Харламаў, вядзе эксперыментальную работу па ўдасканальванню педагагічнай практыкі студэнтаў IV і V курсаў у школе. Сутнасць эксперымента заключаецца ў тым, каб пераадолець тыя сур'ёзныя недахопы, якія назіраюцца ў практычнай падрыхтоўцы студэнтаў да настаўніцкай дзейнасці і значна павысіць яе навучальную эфектыўнасць.

Задума эксперыментальнай працы заключаецца ў вопытнай праверцы наступных палажэнняў. Асноўныя функцыі па кіраўніцтву педагагічнай практыкай павінны выконваць работнікі школы: дырэктар, яго намеснікі па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, настаўнікі і класныя кіраўнікі. Іх працу каардынуе, накіроўвае і забяспечвае яе навуковасць назначаны універсітэтам выкладчык-кансультант. Асноўнай мэтай практыкі павінна быць выпрацоўка ў студэнтаў педагагічнай умеласці, а не майстэрства, як лічылася да гэтага часу. Змест практыкі павінен насіць бінарны характар і ўключаць у сябе, з аднаго боку, асноўныя віды дзейнасці настаўніка і класнага кіраўніка, а з другога -- сістэму прафесіянальна-педагагічных уменняў і навыкаў, якія неабходна фарміраваць у студэнтаў у працэсе гэтай дзейнасці. Практыка павінна быць арганічна звязана з псіхолага-



*Прафесар І.Ф.Харламаў абмяркоўвае са студэнткамі-практыканткамі праведзеныя імі ўрокі.*

педагагічнай тэорыяй і дапамагаць студэнтам асэнсоўваць псіхолага-педагагічныя асновы школьнага навучання і выхавання. Для найбольш эфектыўнай выпрацоўкі студэнтамі педагагічных уменняў і навыкаў для праходжання практыкі іх неабходна прымацаваць да паралельных класаў. Метадычнае кіраванне практыкай павінна быць пастаўлена такім чынам, каб з першых яе крокаў студэнт перажываў поспех у сваёй працы. У сістэме кіравання практыкай, акрамя розных кансультацый і інструктавання студэнтаў, асаблівае значэнне набывае паказ узораў педагагічнай дзейнасці, папярэдняе "праігрыванне" рыхтуючыхся да правядзення ўрокаў і пазакласных заняткаў, правядзенне тэарэтычных субяседаванняў са студэнтамі па пытаннях школьнага навучання і выхавання.

Эксперыментальная работа дае абнадзейлівыя вынікі. Яны асвечаны ў нядаўна выпушчаным дапаможніку "Новая мадэль педагагічнай практыкі: навукова-метадычныя матэрыялы ў дапамогу кіраўнікам практыкі і студэнтам". Як паказвае гэта назва, даследчы калектыў кафедры распрацоўвае новыя навуковыя падыходы да арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі. Рад яе новаўвядзенняў (прымацаванне студэнтаў да паралельных класаў, авалодванне студэнтамі алгарытмам падрыхтоўкі да ўрокаў і пазакласных заняткаў, "праігрыванне" урочных і пазакласных заняткаў напярэдадні іх правядзення і іншыя) набылі ва універсітэце вядомасць і выкарыстоўваюцца ў працэсе педагагічнай практыкі іншымі метадыстамі.



***На здымку: урок геаграфіі ў СШ №16 вядзе студэнтка-практыкантка з гр. ГР-51 Наталля Сердзюкова.***

***Фота У.ЧЫСЦІКА.***

## *Па актуальных пытаннях*

На базе Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я.Купалы адбыўся рэспубліканскі семінар-нарада старшынь прафкомаў студэнтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, намеснікаў старшынь абкомаў галіновага прафсаюза. На ім заслухана і абмеркавана звыш 10 дакладаў і паведамленняў па шырокаму колу пытанняў арганізацыйна-масавай работы студэнцкіх прафкомаў. Удзел у семінары прымала старшыня прафкома студэнтаў ГДУ Н.І.Колтышава, якая выступіла з дакладам "Арганізацыйна-масавая камісія студэнцкага прафкома".

На семінары прынята палажэнне аб Савеце старшынь прафкомаў студэнтаў для калектыўнай выпрацоўкі і ажыццяўлення асноўных напрамкаў студэнцкага прафсаюзнага руху, кардынацыі і ўзаемадапамогі ў дзейнасці прафсаюзных арганізацый навучэнцкай моладзі.

Кожны ўдзельнік семінара атрымаў зборнік нарматыўных дакументаў па праблемах навучэнцкай моладзі, у якім сабраны ўсе ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Міністэрства адукацыі і навукі, што значна дапаможа прафсаюзным лідэрам у паўсядзённай рабоце са студэнцтвам у яго сацыяльнай і прававой абароне.



# АРХЕАЛАГІЧНЫ ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Археалагічная практыка -- важная частка навучальнага працэсу на гістарычным аддзяленні гісторыка-юрыдычнага факультэта. У летні час першакурснікі прымаюць удзел у рабоце археалагічных экспедыцый, вывучаюць помнікі далёкага мінулага Беларусі. Студэнты асвойваюць тонкую, карпатлівую працу археолага, знаёмяцца з арыгінальнымі пасведчаннямі нашай шматвекавой гісторыі, нярэдка становяцца аўтарамі навуковых адкрыццяў. Сёлета практыка праводзілася ў Гомелі і яго наваколлі. Дзвюма студэнцкімі групамі кіравалі асістэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Мікалай Мікалаевіч Мезга і аўтар гэтых радкоў.

Пасожскі край багаты гісторыка-археалагічнымі помнікамі. У нашай зямлі пакінулі свае сляды і першабытныя паляўнічыя, і старажытныя металургі -- сучаснікі Герадота і Тацыта, і амаль абыдзеныя ўвагай летапісца легендарныя славяне-радзімічы. Аб іх апавядаюць месцы стаянак людзей каменнага стагоддзя, умацаваных паселішчаў, курганоў. А ў самым цэнтры Гомеля знаходзяцца рэшткі аднаго са старажытнейшых на беларускай зямлі гарадоў усходніх славян -- Гомія. У задачу першакурснікаў уваходзіў пошук помнікаў далёкага мінулага, вывучэнне іх тапаграфіі, здымка сітуацыйных планаў. І з гэтай працай, якая патрабуе пэўных ведаў і фізічных намаганняў, яны паспяхова справіліся.

Ні сонца, ні дажджу, ні пыльных прасёлачных дарог не спалохаліся А.Сяргееў, М.Кулага, Д.Струцінскі, К.Ступак, К.Барадай, А.Місюк, Р.Шкуратаў і іншыя. В.Сярожкін першым знайшоў рэшткі старажытнай стаянкі на ўзгорках сожскай поймы каля былой Якубоўкі, падабраўшы тут каменныя прылады неалітычнага чалавека. А самыя дакладныя планы гарадзішчаў і курганоў склаў В.Шаўцоў.

Студэнты Д.Лінкоў, В.Даўжэнка, А.Пратапопаў, М.Кашанскі, А.Шклярук, В.Трыфанаў і М.Лубенька прынялі ўдзел у рабоце экспедыцыі, якую арганізавала Акадэмія навук каля Рагачова. Тут, у археалагічных атрадах мінскіх археолагаў Мікалая Мікалаевіча Крывальцэвіча і Ігара Мікалаевіча Язэпенкі, гомельскія гісторыкі ўжо працавалі ў мінулым годзе. Да практыкантаў далучыліся "ветэраны" экспедыцыі -- цяпер студэнты III курса М.Захарчанка, С.Сакалоўскі, В.Дуброўскі. Рамантыка палявога лагера ў маляўнічым урочышчы Прорва запамятаецца надоўга. Але самае галоўнае -- студэнты дапамаглі вучоным раскапаць участкі паселішчаў і магільнікаў, якія існавалі 4-6 тысяч гадоў таму назад. Сярод знаходак -- рэшткі пахаванняў, гліняны посуд, каменныя сякеры, крэмневыя наканечнікі стрэл, скрабкі, нажы. Гэтыя адкрыцці дазваляюць па-новаму паглядзець на малавядомыя старонкі старажытнай гісторыі. Мінскія археолагі высока ацанілі палявую працу нашых студэнтаў.

Матэрыялы даследаванняў экспедыцый універсітэта паступаюць у адроджаны Археалагічны музей кафедры ўсеагульнай гісторыі, дзе яны ўважліва вывучаюцца, экспануюцца, служаць для напісання курсавых і навуковых прац. Музей ствараецца пры непасрэдным удзеле студэнтаў, якія сваімі рукамі рыхтуюць стэнды і планшэты. У мінулым навучальным годзе экспазіцыя папоўнілася стэндамі "Летапісны Гомель", "Касцюм жыхаркі Пасожжа X-XII стагоддзяў", "Неаліт і бронзавае стагоддзе", археалагічнымі картамі Беларусі. Іх аўтары -- студэнты II-III курсаў Л.Бязносік, В.Целюкова, Ю.Пятрова, Ю.Магер, М.Усаў, С.Сакалоўскі, С.Майсеня. Па матэрыялах сваіх пошукаў яны паспяхова абаранілі курсавыя работы, а лепшыя з іх трапілі на студэнцкую навуковую канферэнцыю. Дастаткова сталым з'явілася даследаванне студэнта IV курса Р.Кабашнікава "Абарончы даспех гомельскага воіна XII-XIII стагоддзяў", якое было рэкамендавана кафедрай усеагульнай гісторыі для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ.

Свой уклад у сістэматызацыю археалагічных знаходак, добраўпарадкаванне памяшкання музея ўнеслі і ўчарашнія першакурснікі-практыканты. Умелыя рукі аказаліся ў Я.Міхаленка, А.Тунякова, І.Міругінай, А.Клімянковай, А.Ганапольскага, Я.Фурсеева. Добрасумленна працавалі В.Гурская, Ю.Пухаўская, І.Лабовіч, І.Парфёнава, М.Русіновіч, Ж.Гусейнава і іншыя. Сумесныя намаганні выкладчыкаў кафедры ўсеагульнай гісторыі і студэнтаў ужо далі свае вынікі -- музей адкрыў дзверы для наведвальнікаў. З яго яшчэ пакуль дастаткова сціплай экспазіцыяй пазнаёмілася некалькі соцень чалавек -- студэнты-гісторыкі, правазнаўцы, матэматыкі, выкладчыкі універсітэта і гомельскіх школ, школьнікі, краязнаўцы. У памяшканні музея пачалося правядзенне практычных заняткаў па курсах "Асновы археалогіі", "Археалогія Беларусі", "Гісторыя першабытнага грамадства".

Археалагічны пошук працягваецца. Студэнтаў-гісторыкаў чакаюць новыя здзяйсненні і навуковыя адкрыцці.

**А.МАКУШНІКАЎ,**
**дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

# ДРАКУЛА ГІСТАРЫЧНЫ



***Імя Дракула адразу ж нагадвае нам папулярныя фільмы ды раманы пра жудаснага вампіра. Але не кожны ведае, што гэта быў рэальны чалавек -- палітык сярэднявечча Улад Цэпеш Дракула.***

Улад III, гаспадар Валахіі -- княства на тэрыторыі сучаснай Румыніі -- быў адным з цікавых палітыкаў Еўропы XV ст. Яго імкненні да цэнтралізацыі дзяржавы і ўсталявання самаўладства па сутнасці нагадваюць дзеянні Івана III, Людовіка XI ці нават Чэзарэ Борджа. Але ўмовы здзяйснення і метады рэалізацыі палітычных планаў стварылі яму цалкам адмысловае рэнаме.

Улад III Цэпеш Дракула заняў валашскі трон у 1456г. Мянушку "Цэпеш" -- "той, хто саджае на кол" -- ён атрымаў за прыхільнасць да гэтага пакарання. Мянушку Дракул ён атрымаў ад бацькі -- Улад II Дракул быў рыцарам ордэна Дракона, які ставіў мэту пакарэння язычнікаў (у тым ліку і мусульман) дзеля прымусовай хрысціянізацыі. Але пазней за паталагічную жорсткасць і адыход ад праваслаўя (Улад III у канцы жыцця прыняў каталіцтва) мянушку Дракул ці Дракула пачалі выводзіць ад румынскага слова "драк" -- д'ябал.

Захаваўся прыжыццёвы партрэт нашага героя: жорсткі рот, пукатыя

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 6-СТАР.)

# ДРАКУЛА ГІСТАРЫЧНЫ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 5-СТАР.)

вочы, што нібыта бачылі кожнага наскрозь, арліны нос, бровы і вусы прамыя, валасы доўгія. Быў ён сярэдняга росту, але незвычайна дужы, лічыўся адным з лепшых кавалерыстаў Еўропы. Навуку дзяржаўнага кіравання засвоіў у Турцыі, дзе з 12 гадоў знаходзіўся ў якасці заложніка ў г.Адрыянопаль (Эдзірнэ). Адным з прынцыпаў існавання асманскай сістэмы ўціску была арганізаваная жорсткасць. Улад добра зразумеў гэта і пазней ажыццяўляў у практычнай дзейнасці.

Ён вярнуўся на радзіму ў 1452 г., а праз чатыры гады заняў трон пры падтрымцы трансільванскага ваяводы з венгерскага каралеўскага роду. Новы гаспадар быў сапраўдным рыцарам: храбры ваяўнік і таленавіты палкаводзец, кіраваўся ўяўленнямі абавязку, гонару, справядлівасці. У якасці дзяржаўнага дзеяча ён адпавядаў ідэалу абсалютнага манарха: абапіраўся на ўласнае войска, выконваў законы, спалучаў жорсткасць з захаваннем традыцый. Ён імкнуўся цэнтралізаваць дзяржаву, умацаваць яе эканамічную базу, ліквідаваць апазіцыю і злачыннасць -- і пасля кансалідацыі грамадства вызваліцца з асманскага ярма пры магчымай дапамозе Венгрыі. Такія разумныя і высакародныя мэты забяспечылі яму падтрымку народа. Але ж сродкі дасягнення гэтага выклікалі жах сучаснікаў.

Гаспадар пачаў з умацавання дзяржаўнага апарата і войска як галоўнай апоры ўлады. Але цэнтралізацыі аказвала супраціўленне баярства, якое імкнулася захаваць традыцыйную самастойнасць. Апазіцыя стварыла змову. Тады Улад III склікаў усіх баяраў у сталіцу Тыргавішце і пасля раскошнага балявання пасадзіў на падрыхтаваныя загадзя калы 500 чалавек. Апазіцыя была знішчана фізічна. Саджанне на кол як эфектыўны аргумент псіхалагічнага ўздзеяння на масы зрабілася звыклай справай. Аднак расправа з баярскай апазіцыяй стварыла Уладу Цэпешу рэпутацыю абаронцы сялян: казалі, што баяры народ крыўдзілі, а гаспадар іх за тое пакараў. За Цэпеша былі і гараджане, таму што ён падрымліваў рамёствы і ўнутраны гандаль, а таксама ўплывовая царква, бо ён быў амаль фанатыкам і да таго ж шчодра надорваў духавенства і манастыры зямлёй з сялянамі. Быў у гэтым цвярозы палітычны разлік: праваслаўе з'яўлялася духоўнай базай дзяржаўнага суверэнітэту і сцягам супрацьстаяння знешнім ворагам.

Выкараненне злачыннасці ішло сродкамі фізічнай ліквідацыі крымінальных элементаў. Злодзеі, рабаўнікі, забойцы і нават проста бадзягі караліся смерцю. Асабліва цяжка было цыганам, якіх лічылі патэнцыяльнымі злачынцамі. Але ж справядлівасць пры гэтым захоўвалася: смерцю каралі кожнага злачынцу, нягледзячы на асобу -- і багатых гандляроў, і вялікіх баяр, і нават святароў. Дужа радыкальны Улад III змагаўся з жабракамі. Ён сабраў усіх жабракоў у вялікім будынку, даў шмат піць і есці, а потым спытаў: "Жадаеце, зраблю так, што болей вам жабраваць не трэба будзе?" Тыя ўзрадаваліся і адказалі: "Так". Тады ён загадаў дзверы замкнуць, а будынак спаліць разам з жабракамі.

Гэтымі сродкамі быў наведзены такі парадак, што злачыннасць увогуле знікла. Хронікі таго часу сцвярджаюць, што калі нехта губляў на вуліцы манету, дык нават праз тыдзень знаходзіў яе на тым жа месцы, бо ніхто не браў чужога.

Улад III імкнуўся ўмацаваць сям"ю як аснову дзяржавы. Калі жонка ленавалася латаць мужыку парваную кашулю, яе на кол садзілі. Абараняючы сям'ю, гаспадар жорстка караў любадзеек і распусніц: з іх здзіралі скуру або саджалі на распалены жалезны кол прычынным месцам.

Народ баяўся гаспадара, але і любіў за справядлівасць, вайскоўцы паважалі яго як дужага рыцара і шчодрага камандуючага, царква асвячала яго палітыку сваім аўтарытэтам.

Карыстаючыся народнай падтрымкай і абапіраючыся на цэнтралізаваную дзяржаву, Улад III у 1460 г. рашуча выступіў супраць Асманскай імперыі, адмовіўшыся плаціць даніну. Тая ж крыніца дае звесткі, што гаспадар прычапіўся да турэцкіх паслоў, што прыбылі да яго: "Чаму гэта вы перада мной, вялікім гаспадаром, шапкі не здымаеце?" Яны адказалі, што такі ў турак звычай: нават у мячэці яны застаюцца ў шапках. "Дык я вам гэты звычай умацую", -- сказаў гаспадар і загадаў тым паслам шапкі да галоў папрыбіваць цвікамі.

Улад III знаходзіўся на вышыні славы. І адначасова традыцыйная арганізаваная жорсткасць пачала ператварацца ў дэспатызм у адносінах да падуладных.

Згубілі валашскага гаспадара баярская апазіцыя і вайна з Трансільваніяй. Пад час ваенных дзеянняў туркі разбілі яго баявую дружыну, а сам Цэпеш здолеў уцячы і ад'ехаў у Венгрыю. Але венгерскі кароль не дараваў яму разбурэння Трансільваніі. Цэпеш апынуўся ў цямніцы, дзе прасядзеў амаль 12 гадоў. Не маючы рэальнай улады, ён тыраніў жывёлін, якія траплялі да яго ў рукі. Каб вызваліцца з цямніцы, Улад Цэпеш перайшоў у каталіцтва. Гэта дазволіла яму жыць вольна ўжо ў якасці каралеўскага госця, а потым зрабіць спробу зноў захапіць трон пры падтрымцы Венгрыі.

У 1476 г. Улад Цэпеш вярнуўся на радзіму на чале невялікага войска з венгерскіх наёмнікаў і зноў абвясціў сябе гаспадаром. Але ён не меў болей падтрымкі ў краіне. Былая папулярнасць гаспадара пачала забывацца, а перспектывы аднаўлення тэрору хутчэй палохалі людзей, чым натхнялі. Баярства рашуча выступала супраць вяртання Улада. У пачатку 1477 г. баярскае апалчэнне ўшчэнт разбіла войска Улада Дракулы, сам ён быў забіты, а цела яго пасечана на кавалкі, каб яго не ўваскрасілі Бог ці Сатана. Так скончылася жыццё палітыка, які зрабіў татальны тэрор сродкам умацавання дэспатызму пад прыкрыццём высокіх ідэй парадку і незалежнасці.

**Я.БРОЎКІН,**
**ст. выкладчык кафедры ўсеагульнай гісторыі.**



# СПАБОРНІЧАЛІ ІНТЭЛЕКТУАЛЫ

Цяжка сёння знайсці чалавека, які б не ведаў пра інтэлектуальныя гульні клуба знатакоў "Што? Дзе? Калі?", "Брэйн рынг", што рэгулярна паказваюцца на першым канале тэлебачання. Таму калі стала вядома, што ў Гомелі будзе праводзіцца міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях на Кубак славянскіх чэмпіёнаў з удзелам вядомых каманд, славутых іґракоў -- уладальнікаў многіх ганаровых тытулаў, жадаючых паглядзець захапляючае спаборніцтва сярод гамяльчан аказалася шмат.

Турнір адкрыўся ў актавай зале нашага універсітэта шоу-праграмай, якую вёў не менш вядомы ўсім нам прафесіянальны ігрок Леанід Клімовіч. Тут сабраліся шматлікія каманды Беларусі і Расіі, і сярод іх такія папулярныя, як "Кітай-горад" на чале з А.Корынскім, каманда У.Белкіна, у якію ўваходзіць славуты М.Пашоў. Удзельнічала ў турніры і каманда ГДУ "Злавесныя сухары", якой кіруе А.Мядзведзеў.

Гэта было цікавае, захапляючае дзейства, дзе акрамя непасрэдна саміх паядынкаў паміж удзельнікамі турніру, праводзіліся забаўляльныя гульні з залай, конкурсы, а таксама "Эрудыт-лато" і "Рызыка-версія".

Прыемна ўсведамляць, што інтэлектуальныя гульні сталі вельмі папулярнымі сярод студэнцкай моладзі, школьнікаў нашай вобласці і рэспублікі. Багатыя веды, дапытлівы розум, кемлівасць -- усё гэта фарміруе асобу творчую, цікаўную, эрудыраваную. А ў наш час, згадзіцеся, гэта вельмі важна.

УРАЖАННІ

# ЧАМУ ВУЧЫЦЦА?..

Калі нашы грамадзяне адпраўляюцца ў "далёкае замежжа", то ў першую чаргу сцвярджаюць, што хочуць чаму-небудзь павучыцца, прывезці "што-небудзь новенькае". І прывозяць "відакі", музычныя цэнтры, нават аўтамабілі. Хоць найчасцей не вельмі новенькія. А як наконт навукі? Усяк бывае. Але найчасцей -- аніяк. Ментальнасць іншая, у тым сэнсе, што "мы не дурнейшыя, самі можам таму-сяму павучыць"...

Выкладчыкі замежных моў і студэнты адпаведных факультэтаў, мусіць, маюць найлепшыя шанцы павысіць сваю кваліфікацыю, трапіўшы ў краіну, дзе размаўляюць на той мове, якую яны выкладаюць ці вывучаюць. "Нямецкамоўным" у гэтым сэнсе вельмі шанцуе. Нямеччына шырока адчыніла свае межы для ўсіх, хто хоча добра ведаць яе мову, культуру краіны.

Чаму ж там можна павучыцца, акрамя мовы і геаграфіі? Як ні дзіўна, насуперак таму, чаму нас вучылі марксісты-ленінцы, — на гнілым Захадзе чалавек чалавеку — воўк, у Нямеччыне можна на кожным кроку заўважыць увагу і павагу да цябе незнаёмага чалавека. Пра магазіны ўжо шмат напісана і сказана: там прадаўшчыца ніколі не паздзекуецца з цябе, што ты такі пераборлівы, дзесяць пар абутку перамерыў і ўсё табе штосьці не так. З радаснай усмешкай прапануе нямецкая прадаўшчыца і тое, і сёе, і яшчэ нешта. І цямнейшае, і святлейшае, і цяплейшае, і лягчэйшае, і таннейшае, і даражэйшае. Выбірай! Толькі купі!

Гэта вядома ўсім. А на вуліцы? На скрыжаванні маленькіх вулачак, дзе няма святлафораў? Спыніўшыся на пераездзе, ты раптам заўважаеш, што чалавек за рулём аўтамашыны ветліва ківае табе рукой: пераходзь, я пачакаю, я на машыне... У такіх выпадках мне згадваецца родны Гомель. Тут на сваім прыпынку, выскачыўшы з тралейбуса, рызыкуем трапіць пад колы аўтамабіля, і не толькі айчыннага даперабудовачнага "Масквіча", але і новенькай іншамаркі, гаспадар якой, пэўна, не раз бываў "там" і сваімі вачыма бачыў шафёрскія жэсты ветлівасці.

Мне здаецца, што ва ўсе перыяды нашага жыцця (ва ўсякім разе, колькі я памятаю), замест таго, каб старанна працаваць, мы шмат мітусімся, ствараем ІБД (імітацыю бурнай дзейнасці). Вядзем дэмагагічныя размовы альбо хамім.

На днях, слухаючы па радыё інтэрв'ю аднаго дырэктара саўгаса, я яшчэ раз упэўніўся, што думаю часта гэтаксама: не трэба скардзіцца на цяжкае становішча, трэба працаваць.

Засмуціў выпадак, які здарыўся са мною на мінулым тыдні. Замітусіўшыся, ніяк не мог выбраць часу, каб схадзіць у цырульню пастрыгчыся. Нават перад студэнтамі няёмка. І вось па дарозе ва універсітэт забег у дарагую цырульню. Чаргі няма. Але і руху таксама ніякага. Стаю ў "прылазніку" пяць хвілін, дзесяць, пятнаццаць. Праз паўгадзіны мне трэба быць на працы. Заглядваю за фіранку ў залу: двое майстроў "варожаць" над галовамі кліентаў. Чакаю яшчэ. Варожаць. Яшчэ чакаю. З залы выходзіць прыбіральшчыца са шчоткай. Пакуль тыя варожаць, ёй рабіць няма чаго. За касавым апаратам сумуе касірка. Я не ведаю штатаў гэтай паважанай установы, але ж, напэўна, у сваім кабінеце сумуе і загадчыца. Бо якая паважаная ўстанова можа быць без начальства. Бухгалтар? Не сцвярджаю. Не ведаю. Але мне чакаць ужо няма калі. Вядома, мае праблемы. Ды ўсё ж кажу касірцы: "Вось вы сядзіце, сумуеце, рабіць няма чаго. Хадзіце, падстрыжыце мяне, у мяне часу няма, я — заняты чалавек!"

Як шчыра яна здзівілася! Як лыпнула вачыма і кпліва-пранізліва прасвідравала мяне позіркам: "А што, думаеце, я ўмею стрыгчы?... Якія грошы атрымліваю, так і сяджу".

Што я мог ёй сказаць? Што грошы яна атрымлівае з нашай кішэні. Яна і яшчэ нехта побач, і яшчэ... Гэта разбэшчвае. Не прымушае вучыцца нечаму, чаго ты ўчора яшчэ не ўмеў. Трэба старацца... Трэба круціцца... Сёння працаваць не сорамна. Сядзець без занятку сорамна.

Ат, ведаем мы ўсё гэта...

**С.ЖАГОРАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.**

Увага! Увага! Увага!

# "РАЗАМ ВЕСЕЛА КРОЧЫЦЬ"

***(пад такой назвай адбудзецца конкурс сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў ГДУ)***

Давайце ўспомнім лістапад 1994 года, калі ў фае актавай залы мы ўсе былі гледачамі і ўдзельнікамі конкурсу, у якім выкладчыкі і супрацоўнікі прыемна парадавалі сваёй кулінарнай і творчай фантазіяй заўзятых гурманаў. Былі прызы, але не аказалася пераможаных.

Усе мы ведаем адзін аднаго па сумеснай рабоце. У кожнага ёсць свае захапленні, свае кола інтарэсаў, якім мы аддаем вольны час і энергію душы. Вось і на гэты раз культурны цэнтр ГДУ вырашыў правесці новую шоу-праграму для прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і аспірантаў нашай ВНУ пад назвай "Разам весела крочыць". Па сваёй сутнасці гэта забаўляльны конкурс: хутчэй сямейны, але са сваімі правіламі.

У конкурснай праграме на сцэне ўдзельнічаюць 4 сямейныя каманды па 4 чалавекі кожная. Прычым, адзін з чатырох удзельнікаў абавязкова павінен быць супрацоўнікам, работнікам, выкладчыкам або аспірантам ГДУ, а астатнія тры ўдзельнікі -- мецъ да яго роднасныя адносіны (жонка, муж, сын, дачка, брат, сястра, цёшча, зяць, свякруха, пляменнікі і г.д.) Узрост удзельнікаў каманды -- ад 10 гадоў і старэй (без абмежаванняў). Сама гульня складаецца з 4 конкурсаў, у кожным з якіх свой адзін пераможца. А ў выніку чатырох конкурсаў (па набраных у агульным заліку балах) выявіцца сям"я-пераможца першага ў гісторыі універсітэта такога мерапрыемства.

Культурны цэнтр падрыхтаваў прызавы фонд: бытавую тэхніку, сервізы, цікавыя зборы твораў і шмат чаго іншага, што з'явіцца прыемным сюрпрызам ад кампаніі "Сцімарал" і Гомельскага абкома прафсаюзаў. Ніхто ў гэты вечар не застанецца без прызоў, а галоўнае, мы спадзяемся, усе адпачнуць ад жыццёвых праблем і клопатаў. У шоу-праграму ўваходзяць конкурсы: гаспадарчы, "Мы сустракаем Новы год", конкурс на спрытнасць, увагу і кемлівасць (спартыўны) і тэатральны, які будзе рыхтавацца як дамашняе заданне.

**Конкурс праводзіцца 12 снежня 1996г. (чацвер) з 19.00 у актавай зале. Заяўкі на ўдзел у ім неабходна падаць да 3 снежня ў п. 1-8, 1-7а вуч. корп. N1 (культурны цэнтр) або па тэл. 57-33-30, 57-11-17.**

***Прыходзьце, не пашкадуеце!***

**Аргкамітэт па правядзенню конкурсу, культурны цэнтр.**

---

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- эканамічных тэорый -- дацэнта (2);

-- англійскай мовы -- выкладчыка;

-- эканамічнай інфарматыкі і АСК -- дацэнта;

-- бухгалтарскага уліку, кантролю і АГД -- ст.выкладчыка;

-- оптыкі -- дацэнта;

-- геаэкалогіі -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

---

## Спартыўныя навіны

У Мінску прайшло першынство Беларусі па грэка-рымскай барацьбе ў праграме студэнцкай спартакіяды.

Трэцякурснік факультэта фізічнай культуры майстар спорту Уладзімір Слесарэнка падняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Яго аднакурснік майстар спорту міжнароднага класа Вячаслаў Макаранка ўдастоены сярэбранай узнагароды. Выпускнік факультэта фізічнай культуры майстар спорту Вячаслаў Каваленка заняў чацвёртае месца.

А вось месцы ў агульнакамандным заліку першай чацвёркі: Акадэмія фізічнай культуры і спорту, БДУ, Гродзенскі універсітэт, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны.

♦♦♦

У студэнцкім парку прайшоў асенні лёгкаатлетычны крос у праграме студэнцкай спартакіяды нашага універсітэта.

У камандным заліку, як і ў мінулыя гады, на першым месцы факультэт фізічнай культуры. На другое месца ўпершыню ўзняўся філалагічны факультэт, на трэцім месцы -- эканамічны факультэт.

Назаву тых, хто стаў пераможцам на розных дыстанцыях: Ірына Скрыт (500 м), Віталіна Севасцьянава (1000 м), Леанід Бераснёў (1000 м), Сяргей Цішкоў (3000 м) -- усе студэнты факультэта фізічнай культуры.

♦♦♦

Працягваецца гарадская спартакіяда сярод студэнтаў ВНУ. У спаборніцтвах па міні-футболу першае месца занялі студэнты факультэта фізічнай культуры. Трэцімі сталі студэнты геолага-геаграфічнага факультэта.

**В.МАРЧАНКА.**

---

**Паэтычны дэбют**

**Виталий СЕМЁНОВ**

***

*На что похоже счастье?*
*На брызги в солнечных лучах,*
*А может, на приятное ненастье,*
*Или на звёздный дождь в твоих глазах?*

*А может это лучик, рассеивающий тьму,*
*А может штиль на море,*
*Или гроза в весну?...*
*На все эти вопросы никто не даст ответ.*
*Одно лишь мне понятно:*
*Навечно его нет.*

---

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 574.
Падпісана да друку 21.11.96.